*Прысвячаецца*
*Году малой радзімы,*
*75-годдзю Вялікай Перамогі,*
*620-годдзю г. Валожына*

# АД КАРАНЁЎ ДА КРОНЫ

## ТВОРЦЫ ВАЛОЖЫНШЧЫНЫ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2020

УДК 882.6-1
ББК 84(Беи)6
А28

Укладальнік
*В. Ф. Гіруць-Русакевіч*

А28 **Ад каранёў да кроны** : творцы Валожыншчыны / укл. В. Ф. Гіруць-Руса-кевіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2020. — 242 с.
ISBN 978-985-581-416-1.

Чарговы зборнік народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь», якое працуе пры Валожынскім раённым цэнтры культуры, складаецца з трох раздзелаў. У першым сабраны вершы пачынальнікаў гэтай творчай суполкі, якіх, на жаль, няма ўжо з намі. Але іх творчасць, як тыя карані, жывіць усё новыя галіны і лісточкі літаратурнага дрэва. Другі раздзел уключае творы вядомага беларускага паэта Віктара Шніпа, які ў маладосці кіраваў гэтым аб'яднаннем, і ўдзельнікаў «Руні», якія ўжо з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі. Трэці раздзел сцвярджае, што творчая спадчына на Валожыншчыне не толькі шануецца, але і прымнажаецца, прадаўжаецца сучаснымі галінамі і лісточкамі гэтага літаратурнага дрэва.

Кніга адрасавана шырокаму колу чытачоў.

**УДК 882.6-1**
**ББК 84(Беи)6**

**ISBN 978-985-581-416-1**

© Гіруць-Русакевіч В. Ф., укладанне, 2020
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва «Чатыры чвэрці»», 2020

# На ніве роднае шчыруем

*Дзе лёгка сеецца святло*
*І маюць лёгкі бег сцяжыны,*
*У пушчы самай пад крылом*
*Куток ёсць слынны салаўіны.*
*Здаўна тут талентыраслі*
*І слова спеўнае звінела.*
*Тут, на валожынскай зямлі,*
*Руном ты ясна зарунела.*
*На ніве роднае шчыруй*
*І творчай моцы набірайся!*
*І калі маеш назву «РУНЬ», –*
*Руней, красуй і налівайся!*

Такія шчырыя словы даслаў у свой час удзельнікам народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання «Рунь», якое вось ужо 25 гадоў працуе пры Валожынскім раённым цэнтры культуры, вядомы беларускі паэт, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова, прэміі «Залаты Купідон», Нацыянальнай літаратурнай прэміі Казімір Камейша. І мы, сучасныя ўдзельнікі творчай суполкі Валожыншчыны, стараемся выконваць гэтае пажаданне-запавет. Шануем літаратурную славу свайго краю, слынных літаратараў Беларусі, развіваем уласныя творчыя здольнасці, шукаем новыя таленты і, як можам, дапамагаем ім акрыліцца.

Кніга, якую вы, паважаныя чытачы, трымаеце ў руках, складзена з твораў удзельнікаў народнага літаратурна-мастацкага аб'яднання

«Рунь» ад яго стварэння да нашых дзён. І пачынаем мы свой чарговы зборнік вершамі тых слаўных таленавітых людзей, якія былі ўдзельнікамі літаратурнага аб'яднання яшчэ тады, калі яно працавала пры рэдакцыі раённай газеты «Працоўная слава», і якіх, на жаль, ужо няма з намі. Але ж яны жывуць у сваіх творах, у нашай памяці. А іх літаратурныя традыцыі працягвае і прымнажае ўсё новае папаўненне «Руні». Вершамі і прозай мы расказваем, як любім сваю малую радзіму і ганарымся ёю, як хвалюемся за лёс Бацькаўшчыны, шануем жыццё з усімі яго радасцямі і перажываннямі, спрабуем зазірнуць у будучыню... І ўсім гэтым дзелімся са сваімі чытачамі.

**Валянціна Гіруць-Русакевіч**,
кіраўнік народнага літаратурна-мастацкага
аб'яднання «Рунь»

# КАРАНІ



## Хведар ЧЭРНЯ (1939–1983)

Нарадзіўся ў в. Лінкі Валожынскага раёна. Скончыў Вішнеўскую сярэднюю школу, тэхнічнае вучылішча № 9 пры Мінскім аўтазаводзе, працаваў фармоўшчыкам-ліцейшчыкам. Пасля службы ў войску скончыў філалагічны факультэт БДУ і Мінскую ВПШ. Працаваў рэдактарам на Беларускім радыё, у выдавецтве «Беларусь». З 1972 г. да канца сваіх дзён быў старшым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Аўтар кніг «Добрай раніцы, людзі» (1966), «Дабрэе свет» (1968)», Размова з памяццю» (1970), «Сады юнацтва» (1972), «Настрой» (1974), «Ваколіца» (1976), «Ажаніся, не журыся...» (1979), «Святло рамонкаў» (1981), «На скрыжаваннях памяці» (1982), «Музыка дарог» (1984), кніг для дзяцей.

## Радаслоўная

Не крыўдзіў я ніколі і нікога,
І не хлусіў, і не крывіў душой.
Як быццам з роду-племені другога,
Дзе рос і вырас у сям'і чужой.

А ён жа наш, звычайны род мужыцкі,
І разам з тым – яшчэ музычны род.
Пачаўся ён ад прадзеда-музыкі
І множыўся ашчадна з году ў год.

Ігралі ўмела, спрытна і вясёла.
Самім не дужа весела было.

Пара каўтнуць у вугалку застолля
Ды зноў туды, дзе зборышча гуло.

Цярпелі ўсюды крыўды і насмешкі
І зносілі пагрозы ад п’янчуг.
...Ужо даўно пазарасталі сцежкі,
Што бацька з дзедам пратапталі ўдвух.

А спадчына іх мне перадалася.
Непрымірымая з няпраўдай і хлуснёй,
Яна ўва мне вяселлем аддалася,
Яна жыве і ў музыцы маёй.

Таму вось і мажорна падпяваю
Свайму акардэону пад настрой.
Тады і сам на крыўды забываю
І радую пакрыўджаных ігрой.

Яшчэ хачу, каб сэрцы падабрэлі,
І нашы людзі зажылі дружней.
Няхай у радаслоўнай пастарэлі,
А музыка – званчэй і весялей.

Бо ўжо і сын штудзіруе актавы
І будзе цешыць, весяліць народ.
О, не! Не трэба нам музычнай славы,
Галоўнае, каб жыў музычны род.

***

Са светам добрым не ў варожасці, –
Калі ступіў на сцежку дня, –
Мяне вучыла асцярожнасці
Мая спакойная радня.

Пасля дажджу з ардой вясковаю
Не бегаў я ручэй прудзіць,
Баяўся ў неба васільковае
Нагамі босымі ступіць.

Блукаў між дрэў па травах ціха я,
Каб не спалохаць дзе дразда,
І каменем бусла з буслiхаю
Не гнаў ніколі я з гнязда.

Са школьнай партай
Быў як зліты я, –
О, хоць бы сшытак не прымяць! –
Выводзіў першую я літару,
А потым прозвішча, імя.

Пазней, пазней, калі пад скрыпачку
Іграў музыка «папуры»,
Я выпускніцу, як пярыначку,
Кружыў да ранішняй зары.

І вось ужо ў свет даросласці
Дарога зорная бяжыць.
Мяне вучылі асцярожнасці.
А як жа з ёй у свеце жыць?!

КРОНА



## Віктар ШНІП

Нарадзіўся ў 1960 г. у в. Пугачы Валожынскага раёна. Скончыў Пугачоўскую сярэднюю школу, Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, Маскоўскі літаратурны інстытут імя М. Горкага (1987).

Друкаваўся ў валожынскай раённай газеце «Працоўная слава», дзе некаторы час кіраваў літаб'яднаннем.

Лаўрэат Усесаюзнай прэміі імя Ул. Маякоўскага (1987), Рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2007). За кнігу «Страла кахання, любові крыж» уганараваны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Мастацкая літаратура». Выдатнік друку Рэспублікі Беларусь. Галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура».

***

Мог я нарадзіцца і ў Парыжы,
Толькі нарадзіўся ў Пугачах,
Дзе з лясоў асенні вецер рыжы
Рассыпае лісце па шляхах,
Па якіх вяртацца мне дахаты,
Дзе ёсць хата, толькі ў ёй няма
І не будзе болей мамы й таты
І чакаць іх, і гукаць дарма.
І па лісці я іду асеннім,
Быццам па пражытых мной гадах,
І гатоў паўзці я на каленях,
Каб вярнуцца ў час, дзе ў Пугачах
Мы жывём усе і нам далёка,
Быццам да Парыжа, да кладоў,

Над якімі сонца і аблокі,
Як самота наша і любоў.
І калі бацькі ўжо не чакаюць,
Нас чакаюць восень і клады,
Дзе вятры лісцё перабіраюць,
Як памерлых райскія сляды...

***

Белае золата снегу ўначы
Сыплецца, сыплецца на Пугачы –
Вёску маю, у якой зноў не спіцца.
Сэрца ў грудзях, як у клетцы сініца,
Б'ецца і плача па тым, што прайшло,
Быццам патухла святое святло
Тут, дзе самота і радасць мая,
Тут, дзе заўсёды сваім буду я,
Быццам бы гэтая ў снезе дарога,
Крыж ля дарогі, цяпло ля парога
Хаты бацькоўскай, дзе сёння не спіцца.
Хочацца мне ад самоты напіцца,
Каб пра самоту, як вечнасць, забыцца,
Слухаць, як сыплецца снег уначы
Золатам студзеня на Пугачы –
Вёску маю, адзіноту маю,
Дзе я ў сабе сябе не пазнаю...

Маці прачнецца, і бацька прачнецца,
Стане на вуліцы неба віднецца.
І весялей зноў застукае сэрца,
Нібы жыццё маё нанаў пачнецца...

***

Ты жыў у рыфмах, быццам у вуголлі.
Ты мог заснуць і больш не ўстаць ніколі,
І вершам стаць, які запіша хтосьці,
А запісаўшы, выкіне ад злосці
У вогнішча, бо ўсё не так, як трэба,
Бо суму многа і ў аблоках неба,
Якое ты любіў над Пугачамі
І спрабаваў яго дастаць рукамі,
Каб з воблакаў зляпіць, што пажадае
Дзяўчына найпрыгожая, зямная…
Гляджу ў люстэрка і сябе не бачу,
Але не плачу я, зусім не плачу,
Бо бачу неба па-над Пугачамі,
Якое дастае цяпер рукамі
Хлапчук віхрасты, што рыфмуе «кроў»
Са словам вечна маладым «любоў»…

***

Я іду ў Пугачы, дзе ёсць людзі,
Для якіх наша вёска – наш рай.
І яна апусцелай не будзе,
І не знікне ў траве родны край.

Нам дажджы не затопяць сцяжыны.
Пройдзе дождж і зноў будзе святло.
Будзем мы і ў нас будзе Айчына,
А іначай ці трэба было,

Каб для нас будавалі тут хаты
Нашы продкі і нас берaглі.
Той на свеце заўсёды багаты,
Хто не ўцёк ад бацькоўскай зямлі.

# ЗМЕСТ


На ніве роднае шчыруем. *В. Гіруць-Русакевіч* . . . . . . . . . 3

**КАРАНІ**

**Пятро Бітэль**

«Сяброў, свой кут успомніць міла...» . . . . . . . . . . . . . . . . 6

Жаданы госць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

Асенні пейзаж . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

«Уночы вецер біўся ў вокны...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

«Гляджу на кветку...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

*Пераклады з Адама Міцкевіча*

Да Нёмана . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8

Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

Возера Свіцязь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10

**Хведар Чэрня**

Радаслоўная . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

«Са светам добрым не ў варожасці...» . . . . . . . . . . . . . . 13

Бывала . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

Ад продкаў да нашчадкаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

Дзень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

**Генадзь Равінскі**

Баравікоўшчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

Ісдач . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19

«Быццам сінь дало вам неба...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 20

«Над Люцінкай шчодрае сонца...» . . . . . . . . . . . . . . . . 20

Сейбіт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21

«Жадаю я стаць чалавекам...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

Верш і душа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 22

Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 23

**Уладзімір Градоўкін**
«То вой моторов, то тяжелый топот…» . . . . . . . . . . . . . . . 24
«Жизнь мечтаньям моим потрафила…» . . . . . . . . . . . 25
«Я начинаю по граждански жить…» . . . . . . . . . . . . . . . 25
«Я за себя бояться перестал…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
«От ленивого “не хочу”...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26
«С кем пил, с кем ел…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
*Г. А. Равинскому* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**Антон Гедроіць**
Мая вера . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 28
Навагоднія пажаданні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Вясенні матыў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
Гімн вясне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31
«Лён палола са звяном…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

**Іван Асіпацкі**
Налібоцкі край . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Балада аб родным краі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Ранняя песня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Сакавік у Налібоцкай пушчы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
«Твае вочы…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37
«Каханая, жаданая…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

**Мікалай Палякоў**
О Родине . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Эхо Чернобыля . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Встреча с дятлом . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Мечта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Звезды гаснут красиво . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 42

**КРОНА**

**Віктар Шніп**
«Мог я нарадзіцца і ў Парыжы…» . . . . . . . . . . . . . . . . . 44
«Белае золата снегу ўначы…» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45

«Ты жыў у рыфмах, быццам у вуголлі...» . . . . . . . . . . . . 46
«Я іду ў Пугачы, дзе ёсць людзі...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46
«Бацька вершаў зусім не чытаў...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
«Яшчэ будуць харошыя светлыя дні...» . . . . . . . . . . . . . . . 47
«Снегам усё замяцецца...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48
«Спакойнае неба Айчыны...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 49
«Я прыбіты крыжамі да роднай зямлі...» . . . . . . . . . . . . . 49
Зямля Фердынанда Рушчыца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 50

**Зінаіда Гасціловіч**

Карункі жыцця . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Апошні ліст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 54
Жыццё за ўсё даражэй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Першай настаўніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Забытыя лёсы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57
Не пакінь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 58
Якубу Коласу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
«Заблуджуся аднойчы ў жнівеньскіх росах...» . . . . . . . 59
Дажынкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
Праз гады я ішла . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61

**Валянціна Гіруць-Русакевіч**

Ганарымся і помнім . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 62
Мы – ветэраны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 65
«Не даганяю коней вараных...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Вітанне новага дня . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 66
Час задумацца, зямляне! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67
Акраверш . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 68
«Мой Божа, міласэрны, любы...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
«Хай нехта каркае, як на бяду...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
«За кожную жыцця хвіліну...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 70

**Аляксандр Грынкін**

Что такое Родина . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71
Мой дом . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 72

Дверь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
Борей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Сынок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
Поляна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 75
Звездочка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Звонок . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 76
Тропинка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Мой друг . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 77
Линия жизни . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 78

**Яўген Зялкоўскі**

Пад родным небам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 79
Букет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Водгук жураўліны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
Зіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
Беларуская хата . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
Песня з намі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83

**Дзмітрый Краскоўскі**

Пераправа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Сцяжынка дзяцінства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
Журавы над Івянцом ляцяць . . . . . . . . . . . . . . . . . 87
Максіму Багдановічу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
Настальгія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 88
Гліняны звон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 89
«Калі ў бяссіллі апускаем рукі...» . . . . . . . . . . . . 90
«Душа і плача і смяецца...» . . . . . . . . . . . . . . . . . 91
Сей дабро . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 91

**Міхаіл Курыла**

Родны кут . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 92
Жизнь так устроена . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 93
Не печалься . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 94
Ступени . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95
Доброта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96

Портрет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Никто не знает . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
Повесть жизни пишется судьбою . . . . . . . . . . . . . . 98
Букет ромашек . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
В стране Любовь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100

**Марыя Шакун**

Малая радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
Ручэй . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103
Сцяжынка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Мая Радзіма, любы край . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Ядзя Трацэўская . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 105
Гукі зямлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 107
«Мая душа дамоў імкнецца...» . . . . . . . . . . . . . . 108
Валожын . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 108
Месячык двурогі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109
Край родной . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
«Я твоим разнотравьем не могу надышаться...» . . . . 110

## ГАЛІНЫ І ЛІСЦЕ КРОНЫ

**Надзея Агіевіч**

Милая родина . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 112
Память сердца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
Летняя ночь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Все мы родом из детства . . . . . . . . . . . . . . . . . . 114
Олеся . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
Бабье лето . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Что ж ты, осень... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
Мечта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Молитва ангелу-хранителю . . . . . . . . . . . . . . . 119

**Галіна Гражынская**

Карані і крона . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120
«Асцярожна па сцежцы ступаючы...» . . . . . . . . . . 122

«Вось гэты мілы, родны, вольны край...» . . . . . . . . . . . 123
Краю адзіны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
«Добры вечар, цёплы вечар...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 124
«Пакружы над намі, бусел...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
«Пусть подружка осень...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 126

**Наталля Жызнеўская**

Родны край . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Бацькаўшчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Вёсачка дзяцінства . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 128
Матуліны рукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
Дом родительский . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Дорогому человеку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 130
Летние дожди . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131
Благодарите Бога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132

**Ірына Жытарук**

Паэзія . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
Дороги и души . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Чужой город . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 134
Радоница . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Млечный путь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
Яно і Акіян (проза) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137

**Ганна Кананові́ч**

Новы год . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
«Я кропля твайго жыцця...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Детские глаза . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 140
Берегите любимых . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
«Пусть мое сердце...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141
Весна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
Осень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 142
Ангел . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143
Размышления . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 143

**Генадзь Канцавы**
Приходит осень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Осенняя пора . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Пушистые дали . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Полевые цветы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145
Мы рядом . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Час прощанья . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Прощай, любимая . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 146
Поздняя любовь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147

**Таццяна Косік**
«Мне бы чашку мятного чая...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
«Я в воздухе рисую руны...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 149
Сказка среди нас (проза) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 150
И молвили стражи городов (проза) . . . . . . . . . . . . . . . . 151

**Валянціна Краўневіч**
Простая праўда жыцця . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 154
Знайсці сваю пару . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
Калі імя – Выпрабаванне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 159

**Людміла Краснадубская**
Беларусь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
Вішнёўка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 163
Родина . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
Лето . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
Осень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
Зима . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 165
Погоди . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Скрипач . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 166
Свеча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

**Аляксандр Кулак**
Твая Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
Наша Валожыншчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 169

«Салаўі запелі – цуд і толькі...» .................... 169
Налібоцкі ранак .......................... 170
«Выйду летнім ранкам...» .................... 171
Восені дзянькі .......................... 172
Музыка прыроды .......................... 173

**Сяргей Маляўскі**

Палкі бяссмерця .......................... 174
Ветэраны Беларусі .......................... 176
Валожынскі вальс .......................... 177
«Нічога вечнага няма...» .................... 178
Крэда .......................... 178
«Не думай, дружа, што мінецца ўсё...» .......... 179
«Я, напэўна, зусім не паэт...» ................ 179

**Надзея Матвеева**

«В плену фонтазий, в полусне...» .............. 180
«Показалось, будто бы в окне...» .............. 180
«Не заметили мы...» .................... 180
«Всмотритесь пристально...» .................. 181
Два ангела .......................... 181
«Комом в горле слова стоят...» ................ 182
«Заглядывает утро мне в окно...» .............. 182
«Натруженные, сморщенные руки...» .......... 182

**Галіна Радына-Марцінкевіч**

Родны Валожын .......................... 183
На шчасця крылах .......................... 184
Наталяю душу .......................... 185
Вясновы настрой .......................... 186
Ад ласкавай душы .......................... 187
Шчасця ніць .......................... 189
Прощаясь с осенью .......................... 190
Беларусь моя .......................... 191

**Софія Русецкая**
Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 192
Пад родныя стрэхі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
Маёй матулі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
«Для мяне матуля – яркі промень сонца...» . . . . . . . . 194
Роздум . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195
Сны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 195
«Сыпле восеньскі дождж за вакном...» . . . . . . . . . . . 196

**Людміла Садоўская**
Радзімы куток . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
Мелодыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
Чараўніца восень . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
Загадка судьбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
«Я иду по дороге под названием жизнь...» . . . . . . . . . 200
Мнение . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 201
Три сына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 201
Лето . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 202

**Галіна Філяноўская**
Матуліны рукі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Васільковая Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
«Калі блішчыць раса, як слёзы сонца...» . . . . . . . . . . 204
«Гады свае мы падганялі ў маладосці...» . . . . . . . . . . 205
Нечаканая сустрэча . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
Нежность . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206

**Вацлаў Харук**
Помнікі жыцця . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 207
Памяці маці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
«Я зноў на радзіме...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 209
Бяссонніца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 210
«Вось і ўсё. Адыходзяць гады...» . . . . . . . . . . . . . . . 211

**Юлія Арцюкевіч**
Мая вёсачка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
Буслы над Мінскам . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 213
Каб крылы мне . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 214
«Вось зноўку летні вечар...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 214
«У каждого из нас есть теплый дом...» . . . . . . . . . . . . 215
«Знал бы ты, как мне без тебя плохо...» . . . . . . . . . . . 215

**Міхась Бацян**
Літары . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
Немагчыма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 217
Мадзільяні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 218
«Куды падзенуся, калі не дайду...» . . . . . . . . . . . . . . . 219

**Аляксей Герман (Аляксей Мамонаў)**
Мой горад . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 220
На сцежках . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
Роднае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 221
Первая тетрадь . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
Осенние листья . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 222
Песня старой кошки . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
Последний полет . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
Воложин . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 224
Разлука . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 225
«Я иду по дороге...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 225

**Вадзім Садоўскі**
Малітва . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 226
«У час, як іншыя будуюць дом...» . . . . . . . . . . . . . . . . 227
Каляды . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 227
Мой народ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
Пішу верш . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
Вясна . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
«Я тебе этой ночью приснюсь...» . . . . . . . . . . . . . . . . 230